✓ **26 мая** ў межах святкавання 100-годдзя Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбылося мерапрыемства, прысвечанае славутаму беларускаму бібліёграфу Юліі Іосіфаўне Бібіла (1897 – 1974). Ю. Бібіла была ў ліку першых супрацоўнікаў Беларускай дзяржаўнай і ўніверсітэцкай бібліятэкі (Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У.І. Леніна), якія закладвалі падмурак для яе станаўлення

і развіцця. Праграму мерапрыемства адкрыла выступленне загадчыцы навукова-даследчага аддзела бібліяграфіі Ірыны Градоўкінай, якая распавяла пра бібліяграфічную спадчыну Ю. Бібіла. Цікавымі ўспамінамі пра сваячку, яе сям'ю, малую радзіму падзялілася Валянціна Бібіла, доктар юрыдычных навук, прафесар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Упрыгожаннем мерапрыемства стаў відэаролік, у якім прагучалі ўспаміны Ю. Бібіла аб сваім доме, бацьках, гадах вучобы і працы, праілюстраваныя ўнікальнымі фотаздымкамі. Андрэй Бараноўскі, галоўны бібліёграф навукова-даследчага аддзела бібліяграфіі, прэзентаваў новы інтэрнэт-рэсурс **«Нястомны руплівец на ніве беларускай бібліяграфіі Юлія Іосіфаўна Бібіла (1897 – 1974): да 125-годдзя з дня нараджэння»**, у якім сабраны разнастайныя матэрыялы: летапіс жыцця і дзейнасці Ю. Бібіла, бібліяграфічны спіс яе друкаваных прац і рукапісаў, літаратуры аб ёй, лічбавыя копіі дакументаў, фотагалерэя і многае іншае. Пазнаёміцца з рэсурсам можна на беларускамоўнай версіі партала НББ у раздзеле «Віртуальныя праекты бібліятэкі» (на платформе віртуальнага праекта «Вядомыя імёны»).